*П. Г. ЕРМАКОВІЧ, студэнт БДУ*

# АБВАСТРЭННЕ АНГЛА-ФРАНЦУЗСКІХ АДНОСІНАЎ У КАНЦЫ XIII–ПАЧАТКУ XIV ст.

Абвастрэнне агла-французскіх адносінаў у канцы XIII–пачатку XIV стагоддзяў непасрэдна звязана з пачаткам глабальнага еўрапейскага канфлікта — Стогадовай вайны. Менавіта тыя міжнародные адносіны, якія існавалі ў пачатку XIV стагоддзя, утрымліваюць у сабе асноўныя прычыны гэтай вайны.

Сам ход вайны, яе заканчэнне і вынікі добра даследаваны як у замежнай, так і ў савецкай (расійскай) гістарыяграфіі. Прычыны ж гэтай вайны ў свеце аднасінаў паміж яе ініцыятарамі — Англіяй і Францыяй даследаваны недастаткова. Найбольш дэталева прычынамі Стогадовай вайны займаліся: М. Дзепрэ, А. Кавіль, Ф. Вольф і Ж. Барданова ў Францыі, Т. Таут, Д. Тэмплемен, М. Мак-Кізак у Англіі.

Пры гэтым некаторыя гісторыкі (Ж. Барданова, Дж. Ле Патурэль, К. Фаулер і інш.) зводзілі праблему ўзнікнення Стогадовай вайны да дынастычнага канфлікта асноўнай веткі Капетынгаў (Эдуард III) і бакавой (Філіп Валуа). Уся гісторыя Англіі і Францыі XII–XIII стст. Ле Патурэлем, напрыклад, разглядалася як барацьба Капетынгаў і Плантагенетаў.

Для англійскай гістарыяграфіі пачатку XX–70-х гг. XX ст. характэрны разгляд Стогадовай вайны як экспансіі французскага караля, што з'яўляецца недарэчным. Пры гэтым адмаўляецца матэрыяльная зацікаўленасць Англіі ў Стогадовай вайне (прыбыткі з Гасконі, што дарэчы ў апошняй чвэрці XIII стагоддзя складалі па розным падлікам ад 1/4 да 1/3 штогадовага прыбытку англійскай кароны) і падкрэсліваецца абарончы характар вайны для Англіі (пры тым, што вайсковых дзеянняў на тэрыторыі Англіі не было).

У савецкай і сучаснай расійскай гістарыяграфіі пытанні абвастрэння англа-французскіх адносінаў амаль не даследаваны. Адзіны спецыяліст па гэтай праблеме — Н.І. Басоўская. Яна ўнесла значны ўклад у раскрыццё дадзенага пытання не толькі ў расійскай гістарыяграфіі, але і ў сусветнай медыевістыцы. Ёй належыць шэраг артыкулаў па пытаннях англа-французскіх адносінаў, па пытаннях адносінаў гэтых краін з іншымі краінамі Еўропы. У 1985 годзе выходзіць яе праца «Стогадовая вайна». У ёй Наталля Іванаўна вельмі грунтоўна даследуе прычыны Стогадовай вайны і падкрэслівае значэнне гэтай вайны для Заходняй Еўропы.

Ужо напачатку XIV стагоддзя Еўропа прадстаўляла сабой тэрыторыю, якую можна падзяліць на дзве зоны ўплыву: англійскую і французскую. Так ці інакш большасць еўрапейскіх краін ішлі ў русле або французскай або англійскай палітыкі (за выключэннем бадай адзінай Свяшчэннай Рымскай імперыі, але і яна напачатку вайны выступіла на баку Англіі, у чым несумненна была заслуга таленавітага дыпламата і палітыка Эдуарда III).

Якія ж пытанні былі асноўнымі прычынамі напружанасці адносінаў між Англіяй і Францыяйў

Па-першае, так званае «Гасконскае пытанне». Яшчэ ў сярэдзіне XII стагоддзя англійскі прынц, а потым і кароль, Генрых, які быў сынам Жафруа Анжуйскага (Генрых I, кароль Англіі), вельмі ўдала ўзяў шлюб. Яго жонкай стала адзіная спадчынніца вялізарных уладанняў на поўдні Францыі, дачка герцага Аквітанскага — Аліенора. Пасля смерці спачатку бацькі, а потым і жонкі, Генрых становіцца ўладаром вялікіх кантынентальных уладанняў, што ў гісторыі атрымалі назву Анжуйскай імперыі. Яшчэ слабыя ў той час Капетынгі часова змірыліся з тэрытарыяльнымі стратамі. Але па меры цэнтралізацыі і ўмацавання французскай дзяржавы ўзнікла неабходнасць адваяваць землі. У выніку пасяховых войнаў

французскага караля Філіпа II Аўгуста (1180–1223 гг.) з няўдалым кіраўніком Англіі — Джонам (Іаанам) Беззямельным (1199–1216 гг.), а потым Людовіка IX (1226–1270 гг.) з Генрыхам III (1216–1272 гг.), Англія паводле Парыжскай мірнай дамовы (1259г.) пазбаўлялася ўсіх сваіх кантынентальных уладанняў, акрамя Гасконі. Такое становішча не магло задаволіць ні адзін з бакоў: Францыя імкнулася аб'яднаць пад сваёй уладай усе землі, што раней ёй належалі; Англія са свайго боку праз плацдарм на кантыненце — Гасконь імкнулася вярнуць сабе былыя кантынентальныя ўладанні. Таму ў канцы XIII–пачатку XIV ст. барацьба за Гасконь абвастрылася. Таленавіты палітык — Філіп IV Прыгожы, у 1294 годзе на правах суверэна канфіскоўвае лен у Эдуарда I. Пачынаецца вайна за Гасконь (1294–1303 гг.), але яна як і наступная (вайна Сен-Сардо (1323–1325 гг.) заканчваецца захаваннем за Гасконню status quo. Такім чынам невырашанасць «Гасконскага пытання» яшчэ больш абвастрала англа-французскія адносіны, тым больш, што Гасконь да таго ж была вельмі прыбытковай тэрыторыяй.

Па-другое, важнае значэннне мела і дынастычнае пытанне. Пасля смерці Філіпа IV у 1321 годзе, пачаргова кіруюць яго сыны: Карл IV, Людовік X, Філіп V. Але ні адзін з іх не здолеў завесці спадчынніка мужчынскага полу. У 1328 годзе дынастыя Капетынгаў перарвалася. Паўстала пытанне: хто будзе каралём? Вылучылася 2 прэтэндэнты: англійскі кароль Эдуард III — унук Філіпа IV па мацярынскай лініі і прадстаўнік бакавой лініі Філіп Валуа — пляменнік Філіпа IV. Французскія легісты аддалі перамогу французу, бо аддаць карону англійскаму каралю значыла б знішчыць Францыю як самастойную дзяржаву. Эдуард III быў вельмі абураны.

Увагу заслугоўваюць і англа-французска-шатландскія адносіны. Дзеля ўсталявання супрацьвагі заваёўніцкім намкненнням Англіі, Шатландыя падчас Вайны за незалежнасць (1296–1328 гг.) ідзе на заключэнне союза з Францыяй (1295г.). Гэты союз адыграў значную ролю ў абвастрэнні англа-французскіх адносінаў, бо Англія заўжды лічыла Шатландыю сферай сваіх інтарэсаў.

Эканамічныя сувязі Англіі з Фландрыяй непакоілі Францыю. Бо пасля падпарадкавання вольналюбівай Фландрыі яна б стала эканамічна больш магутнай і пахіснула б эканамічную моц Англіі. Але фламандскія гарады бачылі значныя прыбыткі ў гандлі з Англіяй і таму падчас вайны падтрымалі менавіта яе.

Дзве краіны Пірэнейскага паўвострава таксама ўцягнуліся ў англа-французскую канфрантацыю. Так, у 1288 годзе быў заключаны саюз між Кастыліяй і Францыяй, у той час як Арагон падпаў пад уплыў Англіі. Але як актыўныя саюзнікі гэтыя краіны так сябе і не праявілі.

Такім чынам у пачатку XIV ст. англа-французскія супярэчнасці дасягнулі свайго апагея. Абодзьве краіны рыхтаваліся да вырашальнай бойкі. І калі Францыя пры Філіпе IV была моцнай цэнтралізаванай дзяржавай, то ў другой чвэрці XIV ст. моц краіны ў значнай ступені была падарвана. У той час як у Англіі пасля прыходу да ўлады Эдуарда III пачаўся значны ўздым, Англія ўзяла курс на заваёвы і ўсталяванне свайго панавання ва ўсёй Заходняй Еўропе. Эдуард III вырашыў спачатку адваяваць усе тыя ўладанні, што раней належалі англійскай кароне на канціненце. Для гэтага была патрэбна важкая палітычная нагода. Гэтай нагодай стала ўзыходжанне на французскі прастол не законнага прэтэндэнта — англійскага караля, а прадстаўніка бакавой лініі — Філіпа Валуа. Філіп Валуа, які не сумняваўся ў законнасці сваёй улады, у 1337 годзе канфіскоўвае кантынентальныя ўладанні англійскага караля. Пачынаецца Стогадовая вайна (1337–1453 гг.).